

# МЯШЧАРУК
# Баляслава Юльянаўна

Нарадзілася ў 1934 годзе ў вёсцы Падбалоцце Зэльвенскага раёна.

Баляслава Юльянаўна пачала свой працоўны шлях 15-гадовай дзяўчынкай пасля заканчэння пачатковай школы.

Спачатку вырошчвала лён, пасля тытунь, а з 1965 года – цукровыя і кармавыя буракі. Выконвала і іншыя сельскагаспадарчыя работы. За час працы ў гаспадарцы зарэкамендавала сябе вопытным і працалюбівым работнікам, якая да любой даручанай справы ставіцца адказна. Баляславе Юльянаўне прысвоена званне “Заслужаны калгаснік”.

Пастановай праўлення калгаса, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 06 лютага 1989 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Мяшчарук Б.Ю. занесена ў Кнігу Працоўнай Славы калгаса.